УДК [94(476)+657.6(476)(091)]«18»

**А. У. Ерашэвіч**
Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт

# ДЗЯРЖАЎНЫ ФІНАНСАВА-БЮДЖЭТНЫ КАНТРОЛЬ У БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯХ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТ.

У артыкуле раскрываецца працэс арганізацыі дзяржаўных органаў фінансава-бюджэтнага кантролю на тэрыторыі беларускіх губерняў імператарскай Расіі ў час праўлення імператараў Аляксандра I і Мікалая I. Аўтар, на аснове выкарыстання комплексу разнапланавых апублікаваных нарматыўных прававых актаў і выяўленых упершыню неапублікаваных архіўных дакументаў, вылучыў і прааналізаваў асноўныя кірункі дзейнасці кантралюючых інстанцый па праверцы наяўнасці і захаванасці казённых грашовых фондаў, рэвізіі законнага і мэтавага выкарыстання фінансавых сродкаў дзяржаўнага бюджэту. Адзначаецца, што ў Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст. захоўвалася дэцэнтралізаваная сістэма дзяржаўнага фінансавага кантролю і не размяжоўваліся яго прадметы. З інстытутам фінансава-кантрольнай дзейнасці былі звязаны рахункаводства, касавая, бухгалтарская і злічальна-рэвізійная праца. У беларускіх губернях пастаянныя фінансавыя рэвізіі ажыццяўлялі злічальныя, а з 1831 г. кантрольныя аддзя-ленні казённых палат. Арганізацыйна-структурныя рэарганізацыі і перабудовы кантралюючых установаў не закраналі парадак рэвізійнай дзейнасці. Мадэль незалежнага ад правяраемых і публічнага фінансавага кантролю не была сфарміравана.

**Ключавыя словы:** беларускія губерні, Расійская імперыя, дзяржаўны фінансава-бюджэтны кантроль, дзяржаўныя фінансы, дзяржаўны бюджэт, фінансавая праверка.

**Для цытавання:** Ерашэвіч А. У. Дзяржаўны фінансава-бюджэтны кантроль у беларускіх губернях Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст. // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2022. № 2 (263). С. 11–15.

**A. V. Yerashevich**
Belarusian State Economic University

# STATE FINANCIAL AND BUDGETARY CONTROL IN THE BELARUSIAN PROVINCES OF THE RUSSIAN EMPIRE IN THE FIRST HALF OF THE XIX CENTURY

This article reveals the process of organization of financial and budgetary control state bodies in the territory of the Belarusian provinces of Imperial Russia under Emperors Alexander I and Nicholas I. The study is based on the use and analysis of complex diversified published regulatory legal acts and discloses for the first time unpublished archival documents. The author identifies and analyzes the main activities of the supervisory authorities to verify the availability and safety of public funds, audit of the legal and targeted use of funds from the state budget. It is noted that in the Russian Empire in the first half of the XIX century the decentralized system of the state financial control remained and its subjects were not delimited. Accounting, cash, and auditing work were connected with the institute of financial and control activities. In the Belarusian provinces, constant financial audits were carried out by the counting and, since 1831, by the control departments of the state chambers. Organizational and structural reorganizations of regulatory agencies did not affect the procedure of audit activities. The model of independent audit and public financial control was not formed.

**Keywords:** Belarusian provinces, Russian Empire, state financial and budgetary control, public finances, state budget, financial audit.

**For citation:** Yerashevich A. V. State financial and budgetary control in the Belarusian provinces of the Russian Empire in the first half of the XIX century. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2022, no. 2 (263), pp. 11–15 (In Belarusian).

**Уводзіны.** Як вядома, у сістэме кіравання дзяржаўнымі фінансамі важнае месца належыць кантрольным мерапрыемствам на ўсіх этапах бюджэтнага працэсу і фінансавых аперацый. Дзяржаўны фінансава-бюджэтны кантроль адносна казённых фінансавых актываў звязаны з даходнай і расходнай часткамі дзяржаўнага бюджэту, з пытаннямі бухгалтарскага ўліку (яго арганізацыяй і складаннем справаздач аб выкананні дзяржаўнага

бюджэту), аўдыту (пацвярджэннем, аналізам і ацэнкай верагоднасці даных фінансавай дакументацыі).

Большасць навуковых прац, якія датычацца кантрольна-нагляднай дзейнасці за дзяржаўнымі фінансамі ў імператарскай Расіі першай паловы XIX ст., належаць правазнаўцам і ў пэўнай ступені эканамістам [1; 2; 3]. У іх даследаваннях асноўная ўвага надавалася нарматыўнай прававой базе, формам арганізацыі і працэсу прававога рэгулявання сістэмы разнастайных адміністрацыйных структур дзяржаўных цэнтральных фінансава-кантрольных устаноў, органаў, высвятленню асноўных кірункаў іх фінансавай кантрольна-рэвізійнай дзейнасці. Пытанні ажыццяўлення фінансавага кантролю закраналіся і ўкраінскім гісторыкам Шаўчуком Б. Л. у кантэксце вывучэння структуры, паўнамоцтваў і асноўных тэндэнцый дзейнасці Валынскай казённай палаты ў канцы XVIII – 60-я гг. XIX ст. [4]. У беларускай гістарычнай навуцы адсутнічаюць навуковыя працы, прысвечаныя спецыяльнаму, усебаковаму і комплекснаму аналізу фінансавых кантрольных мерапрыемстваў расійскага ўрада ў бюджэтнай сферы на тэрыторыі беларускіх губерняў Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст.

Неабходна падкрэсліць, што існуе неадпаведнасць сэнсу паміж базавымі катэгорыямі і паняццямі ў мінулых нарматыўных прававых актах, навукова-даследчай літаратуры і сучасным паняційна-тэрміналагічным апараце. У імператарскай Расіі выкарыстоўвалі паняцце «дзяржаўны кантроль», які ўключаў і фінансавую частку. Пад ім разумелі альбо кантрольна-рэвізійную ўстанову, якая ажыццяўляла праверку, ці сам працэс праверкі выканання рашэння пэўнага дзяржаўнага органа, ці арганізацыю нагляду з мэтай «поверки».

**Асноўная частка.** У губернях мясцовыя адміністрацыйныя структуры кантролю за станам дзяржаўных фінансаў арганізоўваліся пры казённых палатах. Яны здзяйснялі шэраг фінансава-кантрольных функцый, уключаючы падатковыя, кантрольна-рэвізійная (фінансавы кантроль дзяржаўных устаноў, службовых асоб, прыватных прамысловых прадпрыемстваў, гандлю), мелі іншыя гаспадарчыя кампетэнцыі. У той жа час захоўвалася частковае аб'яднанне фінансавай часткі з адміністрацыйнай, паколькі рух грашовых сродкаў кантраляваўся не толькі казённымі палатамі, але і губернатарамі.

У абавязкі 6-й экспедыцыі губернскага казначэя казённай палаты ўваходзілі збор звестак пра прыходы і расходы, рэвізіі рахункаў, складанне і адпраўленне штомесячных і т. зв. трэтных (складаліся тройчы ў год) фінансавых ведамасцей у Экспедыцыю аб дзяржаўных даходах пры Сенаце. Усе дзяржаўныя ўстановы, у якіх адбываўся прыход і расход грошай, павінны былі рабіць са штомесячных рахункаў выпіску для падачы ў казённую палату. Губернскі казначэй быў абавязаны неадкладна правяраць злічальныя выпісы, параўноўваць даходна-расходныя артыкулы з данымі акладных кніг, наглядаць «нет ли какого упущения в сборах, утраты казённых денег или неуказных расходов» [5, т. 21, № 15141, с. 92–93].

Паводле маніфеста ад 08.09.1802, у ліку абавязкаў казённых палат пакідаліся справы нагляду і кантролю за паступленнем казённых падаткаў і збораў, дастаўлення грашовых сум у патрэбныя месцы, захавання казённых грошай. З 1811 г. казённыя палаты падпарадкоўваліся ведамству дзяржаўнага казначэя. Згодна з сенацкім указам ад 20.06.1810, члены казённых палат былі абавязаны аглядаць у губернскіх гарадах захаванасць дзяржаўнай грашовай казны [5, т. 31, № 24265, с. 217–219].

06.11.1830 было зацверджана Настаўленне аб парадку справаздачнасці ў казённых палатах і яе экспедыцыях. Фінансаваму кантролю казённай палаты належалі губернатары, прадвадзіцелі дваранства і іншыя чыноўнікі адносна расходаў земскага збору па фінансавых шнуравых кнігах і дакументах [6, арк. 113 адв.; 7, арк. 376–377 адв.]. Рэвізія месячных ведамасцей рахункаў, прыходна-расходных кніг, гадавых справаздач павятовых казначэйстваў, усіх губернскіх і павятовых прысутных урадавых устаноў і службовых асоб аб прыходзе і расходзе сум, якія паступалі, а таксама перапіска па справах фінансавай праверкі, складанне і паданне гадавой генеральнай фінансавай справаздачы казённай палаты ажыццяўляліся ў яе кантрольным аддзяленні на чале з губернскім кантралёрам [8, т. 6–2, № 4833]. Такім чынам, інструкцыя казённым палатам ад 29.09.1831 рэгламентавала парадак справаводства ў іх. У кантрольных аддзяленнях казённых палат, якія з 1821 г. знаходзіліся ў падначаленні Дэпартамента дзяржаўнага казначэйства Міністэрства фінансаў, праводзілася рэвізія грашовых рахункаў усіх дзяржаўных устаноў і службовых асоб. Губернскія і павятовыя ўстановы дасылалі на фінансавую рэвізію ў казённую палату штомесячныя грашовыя ведамасці, а па сканчэнні года – свае бухгалтарскія кнігі і фінансавыя дакументы. На аснове гэтых матэрыялаў казённая палата складала генеральную справаздачу па губерні аб прыходзе, расходзе і рэштках сум. У наступным годзе яна адсылала яе ў дэпартаменты міністэрстваў, якія адпраўлялі ў Дзяржаўны кантроль падрыхтаваныя імі кароткія фінансавыя справаздачы.

Утрыманне служачых у кантрольных аддзяленнях казённых палат пэўных беларускіх губерняў адрознівалася з прычыны неаднастайнасці тэрытарыяльных абшараў губерняў і неаднолькавасці колькасці справаводных папер. У кантрольных аддзяленнях Мінскай і Магілёўскай казённых палат грашовае ўтрыманне з канца 1830 да сярэдзіны 1848 г. рэальна вырасла ў 7,8 разу, у Гродзенскай і Віцебскай – у 7,3 разу, у Віленскай – у 5,6 разу.

Колькасць справаводнай дакументацыі ў казённых палатах павялічвалася, асабліва ў час бюракратызацыі дзяржаўнага апарату царызму пры імператары Мікалаі І. Калі ў мінулыя 1840–1842 гг. Мінская казённая палата абрэвізавала 22490 кніг, ведамасцей і розных рахункаў, то за 1843–1845 гг. ужо 28646, альбо на 27% больш [9, арк. 24]. Толькі за 1843–1845 гг. кантрольным аддзяленнем Мінскай казённай палаты было абрэвізавана 6232 кнігі, 910 справаздач, 8197 розных рахункаў, складзена 360 справаздач, 708 ведамасцей, налічана розных спагнанняў на 35793,15 руб. [9, арк. 21–22; 10, арк. 22–23].

Як правіла, казённыя палаты беларускіх губерняў не выяўлялі значных фінансавых дзяржаўных страт. Так, у 1822 г., згодна з параўнаннем даных па ведамасцях і справаздачах Мінскай казённай палаты, была заўважана нязначная розніца ў паступленнях падатковых збораў у Мінскай губерні ў 1812–1816 гг. [11, арк. 126–128]. У справаздачы Мінскай казённай палаты аб акладных даходах за 1820 г. было паказана ў прыходзе 1295567,4 руб., а паводле ведамасцей вылічана 1338503,35 руб., за 1821 г. – адпаведна 1325582,75 і 1374765,22 руб. [12, арк. 357–358, 565–566]. Гэта тлумачылася не толькі недахопам прафесійных рэвізораў са значным грашовым утрыманнем і іх нежаданнем праводзіць скрупулёзныя лічбавыя падлікі па першасных фінансавых дакументах, заўважаць, параўноўваць і аналізаваць прычыны несупадзенняў даных паказаных прыходаў і выдаткаў грошай у розных тыпах фінансава-справаводных матэрыялаў, але і тым, што назіраліся розныя віды супрацьдзеянняў з боку кантралюемых органаў, якія выяўляліся ў затрымках прысылкі неабходнай фінансавай дакументацыі. Так, Віцебская казённая палата рапартавала 09.08.1827 віцебскаму грамадзянскаму губернатару, што выдаваемыя з павятовых казначэйстваў квітанцыі ў плацяжы дзяржаўных падаткаў і земскіх павіннасцей не заўсёды злічваліся з кнігамі, адпраўляемымі імі на рэвізію ў казённую палату [13, арк. 20–20 адв.].

Такім чынам, рэарганізацыя мясцовых губернскіх фінансава-кантралюючых інстанцый складалася з таго, што ў казённых палатах экспедыцыі рахункаў былі пераўтвораны ў спецыяльныя кантрольныя аддзяленні на чале з губернскімі кантралёрамі. Казённыя палаты, якія сумяшчалі функцыі і рахункаводства, і кантрольна-рэвізійнай дзейнасці, па-ранейшаму знаходзіліся ў залежнасці ад губернатараў і генерал-губернатараў. Разам з тым яны мелі шырокае кола фінансавых абавязкаў, уключаючы ўлік падаткаплацельшчыкаў, нагляд за паступленнем дзяржаўных падаткаў і збораў, фінансавы кантроль, рэвізію даных фінансавай справаздачнай дакументацыі.

Права агляду фінансавай часткі афіцыйных устаноў падначаленых ім тэрыторый мелі генерал-губернатары, ваенныя і грамадзянскія губернатары і іх упаўнаважаныя. Урадавымі чыноўнікамі ў казённых палатах і павятовых казначэйствах праводзіліся агляды наяўнасці грашовых сум (манет, папяровых знакаў кошту), афіцыйных бланкаў розных відаў дзяржаўных дакументаў (паперы, пашпартоў, пасведчанняў, білетаў, ярлыкоў, квітанцый, бандэролей на тытунь, абавязацельных дакументаў). У выніку рэвізій прысутных устаноў выяўляліся факты налікаў, злоўжыванняў з боку чыноўнікаў. Падчас агляду ўрадавымі чыноўнікамі казённых палат заўважаліся выпадкі адступленняў ад законнага парадку вядзення афіцыйнай фінансавай справаздачнасці, адсутнасці ўліковых дакументаў, розніцы і несупадзення фінансавых паказчыкаў у ведамасцях, кнігах, рахунках, адзначаліся факты адсутнасці праверак дакументацыі аб прыходзе і расходзе грошай, цяганіны ў руху афіцыйных спраў і папер, растраты казённых сум і маёмасці. Так, у Мінскай казённай палаце да 1824 г. шмат спраў, кніг і рахункаў было неабрэвізавана амаль з часу адкрыцця губерні і на працягу 26 гадоў большая іх частка была ўвогуле неразабрана. Галоўную прычыну падобнай з’явы шукалі ў недахопе кантралёраў, прыдатных да занятку месцаў, сталаначальнікаў і нават іх памочнікаў, якія ведалі б сутнасць справаводства і пісьмаводства на рускай мове. Некалькі разоў рабіліся спробы запрашэння чыноўнікаў з унутраных вялікарасійскіх губерняў, якім абяцалі павялічыць аклады жалавання звыш штату, аднак жадаючых адшукаць не змаглі [14, арк. 117 адв.].

Яшчэ аднымі інстытутам і інструментам урадавага знешняга кантролю, якія закраналі дзяржаўныя фінансы, выступалі арганізоўваемыя Пецярбургам сенатарскія, міністэрскія рэвізіі, інспекцыі спецыяльных царскіх упаўнаважаных і асабістыя паездкі (візіты) імператараў.

У час праверкі ў 1830 г. Віцебскай казённай палаты чыноўнік Міністэрства фінансаў стацкі

саветнік Галубцоў выказаў шэраг заўваг: у ёй адсутнічалі квітанцыйныя бланкі прыходу і расходу сум у кнізе пра гербавую паперу, не тлумачыліся віды паступленняў асігнацыямі і меднай манетай, назіралася розніца ў відах дзяржаўных даходаў па асобных павятовых казначэйствах за пэўныя месяцы [15, арк. 11 адв., 12 адв., 18–18 адв.].

Сенатарскіх рэвізій у беларускіх губернях імператарскай Расіі ў першай палове XIX ст. было няшмат. Інструкцыі сенатарам для агляду губерняў ад 01.08.1805 прадугледжвалі і фінан-савую праверку казённых палат [16, арк. 339–340]. У час рэвізіі сенатарам генерал-лейтэнантам Ахлестышавым у 1853 г. канцылярыі віцебскага губернатара было выяўлена, што адпаведна даным кніг у прыходзе не аказалася ад розных дзяржаўных устаноў і службовых асоб з 1847 г. па 01.06.1853 сум у памеры 25766,36 руб., якія павінны былі паступіць [17, арк. 66 адв.].

**Заключэнне.** У Расійскай імперыі ў першай палове XIX ст. захоўвалася дэцэнтралізаваная сістэма дзяржаўнага фінансавага кантролю і не размяжоўваліся яго прадметы. З інстытутам фінансава-кантрольнай дзейнасці былі звязаны рахункаводства, касавая, бухгалтарская і злічальна-рэвізійная праца. Па сутнасці, і фінансавы, і бюджэтны, і падатковы кантроль быў злучаны ў адзін. Спецыфікай фінансава-кантрольных адносін было тое, што ў той час адсутнічаў дакладны падзел дзяржаўнага бюджэту ў гэтым ракурсе на даходную (дзяржаўныя падаткі і зборы), расходную (фінансаванне і крэдытаванне за кошт даходаў) і фінансава-кантрольную часткі (праверка мабілізацыі, руху і размеркавання дзяржаўных грашовых сродкаў, прыходу і расходу фінансавых рэсурсаў дзяржаўных устаноў).

Механізм рэалізацыі паўнамоцтваў сістэмы ведамаснага фінансавага кантролю заключаўся ў тым, што ніжэйшыя губернскія і павятовыя ўладныя інстанцыі фіксавалі грашовыя абароты па прыходах і расходах, вялі бухгалтарскія кнігі, складалі гадавыя фінансавыя справаздачы. У кантрольных аддзяленнях казённых палат праводзілася фінансавая рэвізія па сапраўдных дакументах.

У беларускіх губернях мэтанакіраваныя, сістэматызаваныя, пастаянныя фінансавыя рэвізіі ажыццяўлялі злічальныя, а з 1831 г. кантрольныя аддзяленні казённых палат, у якія ўсе дзяржаўныя губернскія і павятовыя ўстановы павінны былі адпраўляць для дакументальнай праверкі штомесячныя фінансавыя ведамасці, справаздачы, кнігі, рахункі, іншыя дакументы. У казённых палатах складаліся агульныя фінансавыя справаздачы, якія пасылаліся спачатку для разгляду і праверкі ў дэпартаменты профільных міністэрстваў, а потым у Дзяржаўны кантроль. Казённыя палаты ажыццяўлялі дзяржаўны фінансавы кантроль у формах папярэдняга, бягучага і наступнага шляхам складання справаздач на аснове касавых бухгалтарскіх кніг, фінансавых дакументаў і рахункаў. Выканаўча-распарадчыя ўстановы, уключаючы казённыя палаты, займаліся самаправеркамі. У дадатак, спецыяльную праверку і рэвізію дзяржаўных фінансавых рэсурсаў, але аднаразова і нерэгулярна, маглі ажыццяўляць упаўнаважаныя службовыя асобы генерал-губернатараў, губернатараў, прадстаўнікі Сената, профільных міністэрстваў, даверанымя асобы імператараў ці яны самі ў час асабістых паездак.

Мадэль незалежнага ад правяраемых і публічнага фінансавага кантролю ў разглядаемы перыяд не была сфарміравана.

## Спіс літаратуры

1. Лагутин И. Б. Государственный финансовый контроль в Российской империи в первой половине XIX века. Курск: Курский гос. ун-т, 2006. 132 с.

2. Лагутин И. Б. Финансовый контроль в Российской империи: эволюция правового регулирования в первой половине XIX века. Saarbrucken, Germany: LAP Lambert Academic Publishing, 2010.152 с.

3. Мизинцева В. В. Государственный финансовый контроль в Российской империи в XIX веке // История науки и техники. 2011. № 5. С. 45–52.

4. Шевчук Б. Л. Здійснення фінансового контролю Волинською казенною палатою наприкінці XVIII – 1860-х рр. XIX ст. // Волинські історичні записки: збірник наукових праць. 2010. Т. 4. С. 132–140.

5. Полное собрание законов Российской империи: собр. 1-е с 1649 по 12 декабря 1825 г. СПб.: Тип. 2-го отд-ния собственной его императорского величества канцелярии, 1830 (ПСЗ-1).

6. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 7594.

7. НГАБ. Ф. 333. Воп. 1. Спр. 710.

8. Полное собрание законов Российской империи: собр. 2-е с 1825 по 1881 г.: в 55 т. СПб.: Тип. 2-го отд-ния собственной его императорского величества канцелярии, 1830–1884.

9. НГАБ. Ф. 333. Воп. 25. Спр. 111.

10. НГАБ. Ф. 333. Воп. 25. Спр. 110.

11. НГАБ. Ф. 333. Воп. 1. Спр. 730.

12. НГАБ. Ф. 333. Воп. 1. Спр. 733.
13. НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 946.
14. НГАБ. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 5296.
15. НГАБ. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 4641.
16. НГАБ. Ф. 295. Воп. 1. Спр. 51.
17. НГАБ. Ф. 1430. Воп. 1. Спр. 25436.

## References

1. Lagutin I. B. *Gosudarstvennyy finansovyy kontrol' v Rossiyskoy imperii v pervoy polovine XIX veka* [State financial control in the Russian Empire in the first half of the XIX century]. Kursk, Kurskiy gosudarstvennyy universitet Publ., 2006. 132 p. (In Russian).
2. Lagutin I. B. *Finansovyy kontrol' v Rossiyskoy imperii: evolyutsiya pravovogo regulirovaniya v pervoy polovine XIX veka* [Financial control in the Russian Empire: the evolution of legal regulation in the first half of the 19th century]. Saarbrucken, Germany, LAP Lambert academic Publishing, 2010. 152 p. (In Russian).
3. Mizintseva V. V. State financial control in the Russian Empire in the XIX century. *Istoriya nauki i tekhniki* [History of science and technology], 2011, no. 5, pp. 45–52 (In Russian).
4. Shevchuk B. L. Implementation financial control of the Volyn State Chamber in the late XVIII – 1860s of the XIX century. *Volins'kí ístorichní zapiski: zbírnik naukovikh prats* [Volyn historical notes: Collection scientific work], 2010, vol. 4, pp. 132–140 (In Ukrainian).
5. *Polnoye sobraniye zakonov Rossiyskoy imperii (PSZ)* [Complete Collection of Laws of the Russian Empire (CCLRE)]. St. Petersburg, Tipografiya 1-go otdeleniya sobstvennoy ego imperatorskogo velichestva kantselyarii Publ., 1830 (In Russian).
6. National Historical Archive of Belarus (NHAB). Fund 1297. I. 1. F. 7594.
7. NHAB. Fund 333. I. 1. F. 710.
8. *PSZ* [CCLRE)]. St. Petersburg, Tipografiya 2-go otdeleniya sobstvennoy ego imperatorskogo velichestva kantselyarii, 1830–1884. (In Russian).
9. NHAB. Fund 333. I. 25. F. 111.
10. NHAB. Fund 333. I. 25. F. 110.
11. NHAB. Fund 333. I. 1. F. 730.
12. NHAB. Fund 333. I. 1. F. 733.
13. NHAB. Fund 1430. I. 1. F. 946.
14. NHAB. Fund. 1297. I. 1. F. 5296.
15. NHAB. Fund 1297. I. 1. F. 4641.
16. NHAB. Fund 295. I. 1. F. 51.
17. NHAB. Fund 1430. I. 1. F. 25436.

## Інфармацыя пра аўтара

**Ерашэвіч Аляксандр Уладзіміравіч** – кандыдат гістарычных навук, дацэнт, дацэнт кафедры эканамічнай гісторыі. Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт (220070, г. Мінск, Партызанскі пр-т, 26, Рэспубліка Беларусь). E-mail: erash06@rambler.ru

## Information about the author

**Yerashevich Aliaksandr Vladimirovich** – PhD (History), Associate Professor, Assistant Professor of Department of Economic History. Belarusian State Economic University (26, Partizansky Ave., 220070, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: erash06@rambler.ru

*Паступіў 02.09.2022*